# Бабруйск далучыўся да «Марафону адзінства»

15.11.2024 08:45 | Аўтар: Нэлі Зігуля | Грамадства

**Свята адчуваецца ў кожным куточку горада, які адразу ж стаў больш урачыстым, усмешлівым, актыўным. Гэтыя рысы характэрны для бабруйчан. Тут асаблівы клімат. А яшчэ імкненне быць арыгінальнымі, непаўторнымі і, галоўнае, згуртаванымі. Бабруйчане чакалі свята, рыхтаваліся, звяралі гадзіннікі. І вось яно прыйшло!**



Яшчэ напярэдадні рэспубліканскай акцыі кіраўніцтва горада чарговы раз праінспектавала асноўныя лакацыі мерапрыемства.

— Па ўсім горадзе ўстаноўлены банеры, паказальнікі, каб сарыентаваць людзей, дзе што адбудзецца, — паведаміў **намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Уладзімір Кніга**. — Жыхары цікавяцца, як, напрыклад, трапіць на «Знакавую сустрэчу» з удзелам заслужанага артыста Беларусі Руслана Аляхно, 21-разовага паралімпійца Ігара Бокага, генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігіна. Яна адбудзецца ў абласным тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча. Афішы ўжо за некалькі дзён да пачатку мерапрыемства заклікалі далучыцца. Некаторыя бабруйчане наогул здзіўляліся, што трапіць сюды можна бясплатна. Бо ў афішы спрэс вядомыя прозвішчы медыйных асоб, якія на слыху.

> Сёння рэспубліканская акцыя цалкам запоўніла горад, зарадзіла яго драйвам, святочным настроем, трапіла на прадпрыемствы, ва ўстановы адукацыі. Навучэнцы Бабруйскага дзяржаўнага механіка-тэхналагічнага каледжа з першых хвілін захапіліся тэмай «НЯсумнай НЯлекцыі». На ёй ім прапанавалі выбраць паміж... яблыкам і вафляй. Чацвёртакурснік Ілля Дзікалаў выбраў яблык. «Я за здаровы лад жыцця, — аргументаваў ён. — Мы кожны дзень сутыкаемся з выбарам — ісці на лекцыю або не, зрабіць зарадку або не, купіць шакаладку або той жа яблык. Трэба рабіць усё асэнсавана, памятаючы пра наступствы».

— Сама назва «НЯсумная НЯлекцыя» прываблівае, — адзначыла ў размове з журналістамі **намеснік міністра адукацыі Кацярына Пятруцкая**. — Мы размясцілі афішы загадзя, і ў навучэнцаў быў выбар прыйсці або не. Ім падабаецца адкрыты фармат, мы праводзім «НЯсумныя НЯлекцыі» ў вялікіх аўдыторыях, адкрытых фае, дзе не бывае заняткаў. У нас шмат крэатыўных творчых выкладчыкаў, якія працуюць нестандартна.

Цікавасць да прадмета наогул пачынаецца з цікавасці да асобы выкладчыка. А нашы педагогі ўмеюць валодаць увагай аўдыторыі, методыкай, забяспечваюць якасць выкладання, вядуць за сабой моладзь.

Удзельнікамі «НЯсумнай НЯлекцыі» ў каледжы сталі прадстаўнікі кіраўніцтва МАЗа, прадпрыемства, якое з'яўляецца заказчыкам кадраў, якіх рыхтуюць у каледжы.

У навучэнцаў была магчымасць задаць пытанне наўпрост, пацікавіцца, што трэба для таго, каб прайсці кар'ерную лесвіцу і заняць кіруючыя пасады.

Наогул, у праграме шмат крэатыўных нестандартных падыходаў, якія спачатку бянтэжаць, а потым цалкам апаноўваюць увагай. Упершыню ў Бабруйску на заводзе буйнапанэльнага домабудавання практыкавалі такі незвычайны экспромт, як танцы ў цэху. Спецыяльна для канцэрта «Разам працуем, разам спяваем» працоўная пляцоўка на некаторы час ператварылася ў канцэртную. Кранаўшчыкі, мантажнікі, арматуршчыкі ў рабочым адзенні «запальвалі» ўслед за беларускімі зоркамі. «Не сустрэча — агонь», — так ацанілі мерапрыемства яго ўдзельнікі. Эмоцыі што ні ёсць сапраўдныя. На тварах — усмешкі, у вачах — агеньчыкі.

У ліку чаканых падзей — удзел у марафоне Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь, асабліва для музычнай школы № 2. Сёння артысты аркестра правялі ў навучальнай установе майстар-класы. А сёння заслужаны калектыў выступіць на ААТ «ФанДАК».

> У горадзе праходзіць шэраг выстаў. Ужо ў першы дзень шмат бабруйчан наведалі выставу «Беларусь. Узлёт» Беларускага тэлеграфнага агенцтва. Яна размясцілася ў гандлёвым цэнтры па вуліцы Мінскай. Сорак яркіх здымкаў, зробленых трыццаць гадоў таму і цяпер. Факты, як той казаў, сведчаць за сябе.

А ў Бабруйскім мастацкім музеі па вуліцы Горкага была магчымасць далучыцца да інтэрактыўнай выставы «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах», заснаванай на матэрыялах унікальнага мультымедыйнага інтэрнэт-праекта «Партызаны Беларусі». Яе прэзентавалі Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» і Нацыянальны архіў. У экспазіцыі — унікальныя фатаграфіі часоў Вялікай Айчыннай вайны, узнагародныя лісты і баявыя характарыстыкі вядомых камбрыгаў, Герояў Савецкага Саюза, радавых байцоў партызанскіх атрадаў. Сёння выставу можна наведаць на пляцоўцы перад спартыўным комплексам «Бабруйск-Арэна».

Як выказаўся ў дзень пачатку акцыі ў Бабруйску **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё», праз розныя формы — лектарскія, асветніцкія, псіхалагічныя трэнінгі, музычныя шоу, выступленні спікераў — дэманструецца адзінства, кансалідацыя грамадства, агульнасць культуры, ідэалагічных поглядаў, палітычнай пазіцыі. «Мы разам», «Мы адзіныя», «Час выбраў нас», «Мы за мір» — гэтыя пасылы зразумелыя кожнаму.

Суботняя праграма марафону яшчэ больш насычаная.

З 10:00 да 22:00 каля «Бабруйск-Арэны» праходзіць праграма актыўнасцяў, працуюць забаўляльныя пляцоўкі, фуд-корты, праводзіцца квэст ад БРСМ і розыгрышы прызоў. Завершыць марафон музычнае шоу «Час выбраў нас», у якім прымуць удзел заслужаныя артысты Беларусі Руслан Аляхно, Алена Ланская, арт-група «Беларусы», група «Аўра» і іншыя.

*Больш падрабязна пра другі дзень марафону чытайце ў наступным нумары «Звязды».*

**Нэлі ЗІГУЛЯ**


Навіны
09:35 Тр
Кэралайн
Белага до
09:00 Лу
Вы з гона
дадзенае
абяцанне
21:10 У с
парывість
20:10 Тр
працавац
канфлікту
19:51 Дз

Іншыя
Магілёўш
«Дажынкі
У Магілёв
агульныя
інвалідаў
Па матыва
Клімавічь
абласныя
Захаваная